Работница, работает на ф-ке „Октябрь" в течении 3-х лет. Член расцен.-конфликтной комиссии, делегатка Женотдела энергична, пользуется у себя на ф-ке большим авторитетом, ведет работу среди работниц, делегатка Всебелорусского с'езда полек.

3-я участковая жел. дор. конференция работниц и жен рабочих Западной дороги.

Рвутся к работе.

На ст. Минск Зап. ж. д. 24 января открылась 3 участковая жел. дорожная конференция работниц и жен рабочих Зап. дор. на каковую приехало с линии 22 делегатки и со ст. Минск Зап. д. 48 делегаток.

Работа конференции прошла деловито и серьезно. Пять месяцев тому назад на прошлой конференции делегатки с маленьких глухих станций и раз'ездов почти совсем не выступали и робко жались одна к другой. На этой же конференции делегатки этих же станций и раз'ездов смело и деловито выступали по всем вопросам, ярко и правильно излагая свои мысли о плохих и хороших сторонах их жизни и быта.

Они с гордостью заявляли, что их дети комсомольцы и пионеры.

Все это говорит за то, что хотя они женщины живут почти в лесу, оторванные от города, а иногда и от деревень по расстоянию, тем не менее они всеми силами стараются не быть в стороне от общественной жизни, а наоборот, рвутся к этой работе, требуют помощи в этом.

Пусть же растут наши конференции, а вместе с ними пусть растет забитая женщина-транспортница.

Транспортница **Бессарабская.**

БУРАЧЕНОК АННА

60 лет, Полоцкого округа, Ушацкого района, Борковичского сельсовета.

Крестьянка-беднячка, полька. Член комитета взаимопомощи. Делегатка 1-го Всебелорусского с'езда полек, активно выступала на с'езде в обсуждении всех вопросов.

ЛІТАРАТУРНЫ АДДЗЕЛ.

У ШВАЛЬНІ

Кожны дзень—толькі раніцы змрочнасьць
Прыадчыніць завесу дню—
Ў швальні чуецца голас дзявочы
Або песня—запал агню.

Што-квадранец за гукам гук новы
Нараджае машынны бег;
Нітка з ніткай кладзецца ў аснову,—
Дзе іголка дзюру праб'е.

Па сукне, па прыгожым паркалю
Расьцілаюцца сьцежкі-швы
І паўзуць і паўзуць стройна ў далі
Па адзнаках—клетках канвы.

Рукадзельле кладзе каляровасьць
Нейкай новай для ўсіх красы:
Спадабаўся мамонак вясковы—
Беларусі жар-паясы.

Тут нямала кладзецца ў дзень працы,
Завіхаецца многа рук!
Шыюць тут падарунак сялянцы
Ды чырвоны сьцяг змагару.

Шыюць тут для працоўных адзеньне,
Для штодзеннага іх жыцьця;
Тут, у швальні, ўсіх прац завяршэньне,
Тут для працы новай куцьця.

Праца тых, хто араў голы, босы,
Хто палоў, потым праў хто лён,
Грукатаў хто паставамі кросен,—
Набывае ўжо новы плён.

Гэты плён—усіх працоўных здабытак,
І загэтым ён—важны дар:
Хто раней быў бядою прыбіты,
Цяпер стаў сам сабе гаспадар.

Вось загэтым, хоць праца цяжкая,
А удубальт пасьпешна йдзе;
Зык машын на мамэнт не змаўкае,
І ў ім чуецца шмат надзей.

Вось загэтым кладуцца так роўна
Швы за швамі ў пекны узор,
Вось загэтым так песьня чароўна
Льлецца з раньніх да змрочных зор.

А. Гурло.

ДЭЛЕГАТКА.

(*Апавяданьне*).

Пара вачэй пільна ўглядалася ў печ. Гаспадыня зухавалася.

Вочы Аўгіні (так звалі гаспадыню) былі завяўшыя, з павуцінай зморшчынак вакол. Пломень з печы адбіваўся ў іх мутнаватым блескам, нібы ў затуманеным люстэрцы.

Муць у вачох і павуціна вакол іх гаварылі, што Аўгіня ўжо доўгія-доўгія гады пазірае вось у гэту печ, стаіць так абаранкам скручаная і глядзіць-глядзіць на агонь, нібы бачыць у ім таямніцу жыцьця свайго. Малінавыя кудзерцы агня расчэсваюцца залацістымі пальцамі, сьмяюцца пылаючыя вочы з печы на Аўгіню гледзячы і нібы кажуць бяз слоў:

— Навекі ты, Аўгіня, прыкута да нас, навекі.

Пу-ўх-пу-ўх!—трышчыць загнёт на гарачым гліняным подзе і сьмяецца-рагоча, абдаючы гаспадыню дымным жарам.

Варушыць Аўгіня вілачнікам гаршкі, чапялою патэльню совае да вугольляў і клапоціцца. Яна сур'ёзная, як той камандзір, які войска перакідвае з месца на месца, з фронту на фронт.

Твар гаспадыні асьвечваецца агнём, зморшчыны на шчоках глыбеюць, і ўсё яе аблічча выглядае глінянай патрэшчанай пасудзінай.

Кожны рух старой гаспадыні—руплівасьць. Кожны яе паварот—заклапочанасьць. Кожны ўзмах рукі—кемнасьць, захопленасьць.

Пакаштуе Аўгіня страву з гаршка, памайстэрску губы зморшчыць, і ўсе рухі яе на хвіліну застываюць—яна робіцца як-бы з каменя.

Гэта яна ўважліва і крытычна прыслухоўваецца да смаку. Крутне галавой—значыць, яшчэ ня ўсё ў парадку. Як той аптэ-

кар, асьцярожненька пусьціць пару апцугоў—закарэлых пальцаў—у круглую бярэсьціну, шчыпне некалькі драбінак солі і трусіць у страву. Так акуратненька сыпіць, што ні пыліначка солі на бок не страсянецца.

Гэта яшчэ ня ўсё. Гаспадыня выцягвае губы трубкай, бровы накасурыць на гаршок і кемным вухам прыслухоўваецца да бульканьня вады ў гаршку. Нібы ў гаршку знаходзіцца ўсё яе жыцьцё, якое варыцца і кіпяціцца. Як нейкую музыку, гаспадыня любіць бульканьне вады, прыслухоўваецца да малейшых перабояў і перазвонаў у гаршку і, паводлуг гутаркі стравы, угадае ў якую хвіліну яда будзе гатова.

Гаршкі—работа паміж іншым. У параўнаньніі з галоўнай работай—гэта нават не работа, а так сабе глупства.

Галоўнае—бліны.

Тут Аўгіня чуецца, як тая рыба ў вадзе. Пякчы бліны Аўгіні надта прыемна, бо гэта рэч ня лёгкая, а чым цяжэй, тым прыямней. Тут ад пачатку да канца патрабуецца вялікі спрыт, кемнасьць і надзвычайная уважлівасьць, што выпрацоўваецца практыкай многіх гадоў. Гэту работу трэба ўмець, і Аўгіня ўмее. Гэта яе гордасьць.

На шырокім жаўтаватым, патрэсканым тапчане ў начоўцы, нібы мёд ліпавы, залаціцца рошчына, ахопленая сеткай бурбаўлак-пузыркоў.

Кіне Аўгіня на патэльню шматок сала, белага, як сьнег, з празрыста-ружовым адценкам колеру неба на заходзе сонца. Так падсмажыць, што і сала многа ня выходзіць і блін не прыстае да патэльні. Сала распусьціцца з лёгкім сквіргатаньнем па дне патэльні, пакрые яе глянцам, нібы наваксаваны бот у франта, тады чабух з вялікай дрыўлянай лыжкі рошчыны ў патэльню, пакруціць-паверне рукою патэльню ва ўсе бакі і-ж-ж-жух: расплываецца рошчына жоўтай паводкай роўным, круглым слоем.

Па ўсёй хатцы ад патэльні расплываецца густымі хвалямі смачны пах, які апэтытна казытае ў нос, прыемна гладзіць горла і разыходзіцца нявідочным туманам па ўсіх кутох і шчэлінах убогай хаткі.

Паставіць Аўгіня патэльню на под гарачы, воддаль ад агню, каб ня прыпёкся блін, пакруціць да агня ўсімі краямі, потым спрытна пераверне блін на другі бок, блін робіцца пульхным, прымае ружовы колер, нібы круглы твар маладой дзяўчынкі.

У Аўгіні нават і першы блін комам ня выходзіць.

Расьце стопка бліноў на белым абрусе, засланым на зэдліку, падымаецца ўгору, як той стог на балоце, соўваецца ўверх бліновая байка.

Па блінох Аўгіня як-бы чытае кнігу аднастайнага жыцьця свайго, чытае моўчкі, нічога нікому ня кажучы.

Усе дні тыдню Аўгіня з нецярплівасьцю чакае нядзелі, каб займацца сваёй улюблёнай работай—пякчы бліны.

Дзяцей у Аўгіні няма—і першы пачастунак ад бліноў маюць кот і певень. Яны галоўныя ацэншчыкі яе таленту. Бярэ яна блін, рве папалам і дзьве палавінкі выходзяць роўненькія, нібы дно ад дайніцы папалам разломанае. Кідае гаспадыня гэтыя палавінкі сваім гадунцам—кату і пэўню.

Кот есьць спакойна, аблізваючыся, а певень хутка дзяўбе блін і робіць яго на рэшата. Аўгіня расчульваецца і падлівае ім распушчанага сала.

Глядзіць Аўгіня, як яны смакуюць бліны, і па яе твары ледзьве прыметна ўспыхвае ўсьмешка. Не такая ўсьмешка, як у большасьці людзей, пырскаючая аганёчкамі і вабячая вясёлымі іскрамі—не.

Дзіўная ўсьмешка ў Аўгіні—падобная да плачу—твар нібы памылкова задумаў усьцешыцца, але зараз-жа папраўляецца, і ўсьмешка пераходзіць у грымасу плачу, нават вочы туманяцца сьлязьмі, толькі гукаў плачу ня чуваць.

Твар Аўгіні мае на гэта пэўную прычыну: ён прывык штодня моршчыцца ад плачу, і іншы выгляд ён ужо прыняць ня можа.

Прыдзе Яўхім (муж Аўгіні) п'яны і зараз-жа бярэцца біць жонку.

За што? Чаму?

Вось нешта скрабе сэрца, чэшуцца рукі—біцца самі лезуць. А як на чужых наступіш, дык яны,—дзіўная рэч,—як тая качарга, зараз-жа назад на лоб Яўхіма наскочаць. Ён, хоць п'яны ў дрызг, а гэтага ня любіць.

А жонку бі колькі ўлезе—ні словам не супярэчыць, бо такі закон сам поп ёй на ілбу напісаў, каб слухалася мужа.

Аўгіня—маўклівая, пакорлівая істота—ні словам не супярэчыць. Яго рукі за жонку, каб пабіць, а яе рукі за хвартух, каб выціраць ціханька сьлёзы...

Гэтак адбываецца бадай штодня. Абодва да гэтага прывыклі. Гэта як-бы запаўняе ўсё іх жыцьцё. Бяз гэтага было-б нудна. У

Яўхіма проста думкі прапахлі самагонам. У Аўгіні ў касьцях гарачыня ад кулакоў п'янага мужа.

Рэволюцыя нібы абмінула іхнюю хатку. Вакол нешта шумела-мітусілася, а яны як жылі, так і жывуць. Ня надта што ўцяміш у тым, што робіцца вакол, калі Яўхіму трэба гойсаць па хутарох і засьценках самагонкі шукаць. Яго жонка ведае толькі хату, поле сваё і той блакітны блін неба, які вісіць над яе галавой. На парадкі ў хаце, на ўвесь нудны аднастайны быт жыцьця свайго Аўгіня мае адзін адказ:

— Так трэба!

Жыцьцё Аўгіні было роўнымі шалямі, якія заўсёды стаялі на адным месцы і ня зыбаліся ў бакі.

А вакол жыцьцё новае біла сьвежай крыніцай. Постаці людзей выпрасталіся. Вочы новым блескам гарэлі. У голасе адчувалася цьвёрдасьць, пэўнасьць. У кожным руху відаць было, што ранейшы лапатнік адчувае сябе гаспадаром над сабою і над усім акружаючым. Кожны разумее вартасьць, сэнс і радасьць жыцьця ў нейкім надзвычайным імпэце працы—працы не паасобку, дзе адзін на аднаго глядзяць, як на ваўка, а працы агульнай, дзе кожны зьяўляецца адным з вялікай кроўнай сям'і-грамады.

Нават акружаючае: хаты, поле і лес у сваім старым выглядзе набылі новы зьмест, тварылі новыя настроі. Вялікі бунтар-грамада сарвала з прыроды луску папоўскай і вядзьмарскай забабоннасьці і страху. Усё апранулася ў сонечны блеск новых песень, новых разважаньняў і новых учынкаў. Прастор вабіў зусім іншымі казкамі—гэроічнымі казкамі барацьбы за лепшы лёс для людзей.

Паіншаму шарэлі імшалыя скрыні вясковых будынкаў, паіншаму зьвінела птушкамі даль палёў, паіншаму ківаў цёмназялёным шаломам лес, бо людзі іншымі вачыма на ўсё пазіралі, палаючымі сэрцамі атулялі спавівалі ўсё навакол.

Сяляне зьбіраліся на сходы, абгаварвалі розныя свае правы, гарачыліся, злаваліся, разважалі, сумавалі, радаваліся.

Новыя словы нейкімі невядомымі птушкамі мітусіліся вакол: організацыя, коопэрацыя, выбары, узаемадапамога, трохполка, комсамол, хаты-чытальні, ліквідацыя няпісьменнасьці і г. д. і г. д.

Аўгіня чула гэтыя словы не на сходзе, дзе іх ясна тлумачылі, а з трэціх або чацьвертых вуснаў, дзе кожны пасвойму перарабляў гэтыя словы, калечыў іх, перакручваў—і словы ў вушох Аўгіні аддаваліся дзівоснымі, незразумелымі водгаласкамі. Яны зьвінелі, як нявідочны, але буйны град. Яны, словы гэтыя, блуталіся, як маток нітак. Кожнае з гэтых слоў Аўгіня прадстаўляла нейкай жывой істотай, надзвычайнай, нявідочнай да гэтага часу. Аўгіня адчувала нават як-бы асаблівы пах гэтых слоў: пах кажуха з махоркай, зьмешанае з потам. Гэтыя словы складваліся часам і ў рыфму, як „гарнізацыя" (організацыя), „капірацыя", „лікадацыя" (ліквідацыя) і г. д. Гэтым яны яшчэ больш цікавы былі, набывалі таемную сілу, вабілі да сябе, як каляровыя пацеркі.

Вось як прабівалася рэволюцыя ў сэрца Аўгіні праз нявідочны паркан, якім яна агарадзілася ад новага жыцьця.

Але аднаго разу здарылася нешта такое, што ўзварухнула роўнавагу жыцьця Аўгіні. Гэта было ў нядзелю—у дзень Аўгініных бліноў.

Яўхім быў учора на сялянскім сходзе мо' ў першы раз за ўсе годы. Надзвычайны быў гэты сход: сяляне пастанавілі выдаць савецкай уладзе ўсіх самагоншчыкаў свайго сельсавету. Яўхіма гэта што называецца за жывое калупнула. Сягоньня раніцай ён абегаў усю ваколіцу і ніводнай пляшкі сівухі не дастаў—баяліся даць.

Па скрыпу дзьвярэй, па адрывістаму шлёпаньню лапцёў, па строга-адчайнаму выразу вачэй Яўхіма Аўгіня зразумела, што сягоньня з яе мужыком нешта надзвычайнае чыніцца.

Жудасна ёй зрабілася ад таго, што Яўхім сягоньня ўвашоў у хату бяз п'яненькіх частушак-песень, бяз п'янага шорханьня і гусінага перавальваньня з боку на бок.

Неяк ня звычна...

Спачатку Яўхім сеў на лаву і дзікім зрокам уткнуўся ў падлогу. Потым ён падняўся, паблядзеў і давай, як воўк, блыскаць вачыма, памацываць імі ўсе куткі, нібы адчуваючы там нейкага страшнага ворага, схаванага пад старымі бэбахамі.

Потым Яўхім утаропіў вочы ў жонку, якая задрыжала ад страху, як асінавы ліст.

У вачох і рухах селяніна было нешта такое пэўнае, рашучае і халодна-рэзкае, нібы раптам знашоў таго, чаго ўсё жыцьцё сваё шукаў, знашоў нібы свайго заядлага ворага, якога во зараз зьнішчыць.

Твар Яўхіма крывёй наліўся, на ілбу, шыі выступілі жылы, нібы пляцёнкі кошыка: Яўхім пачаў біць вокны, пасуду, гаршкі, пе-

равярнуў начоўку з рошчынай і рабіў страшны садом у хаце.

Аўгіня, як няжывая, ня рухалася з месца, разьзявіла рот, як-бы паветра ёй не хапае, і вытарашчыла вочы...

Як на тлустага селядца пасьля ёмкай выпіўкі, Яўхім накінуўся на сваю жонку...

Пачаў яе біць...

Біў яе, як ніколі да гэтага часу. Валачыў па падлозе, ірваў за валасы, камкаў яе цела кулакамі з нейкім надзвычайным смакам, ажно пена выступіла на яго губах. Гэты смак чуўся ў яго „г-г-ээ!!!", якое вырывалася хрыпла з яго грудзей пры кожным удары, нібы ў дравасека, які рупна сякерай працуе.

Першы мо' раз у сваім жыцьці Аўгіня ня вытрымала — падняла громкае галошаньневыцьцё.

Яўхім зьдзівіўся—ён ня прывык да такога адказу на свае пастаянныя бойкі, і спыніўся раптам. Разьмяк і асеў.

У страшным выглядзе жонка вырвалася, выскачыла з хаты.

За ёю, як звыкла, пабеглі кот і певень, якія ніколі не разлучаліся з ёю.

З прычытаньнямі і плачам ішла яна па вуліцы, ішла, перавальваючыся з нагі на нагу, пакалечаная, вымазаная ў бруду, у парваных вопратках.

Не заўважыла, як на яе суседзі зьдзіўлена паглядалі, ківалі галовамі; ня чула людзкіх запытаньняў: „што? як? куды?"

Сэрца Аўгіні кіпела, нібы вар у гаршку. Думкі разгортваліся, мо' першы раз у жыцьці, так моцна, так шырока, нібы тоўстая трубка кужалю, якая доўгімі гадамі ляжала на самым дне кубла, ляжала ня выбеленая, а вось толькі цяпер яе раскручваюць-раскладваюць на гумне пад сонцам.

Так Аўгіня ў думках сваіх разгортвала цяпер усё сваё жіцьцё. І першы раз ёй так крыўдна зрабілася на мужа, на сваю вечную пакорлівасьць, на сваю цемнату...

Першы раз у жыцьці яе вечнае „так трэба" зьмянілася на „так ня трэба".

Аўгіня ішла ўсё шпарчэй і шпарчэй. У хаце за ўсе свае гады яна адвыкла думаць, была як нейкая няжывая рэч, прыстасаваная да печы, як вілачнік ці качарга, а тут пры хадзьбе ў надзвычайным настрою, адчуваючы боль ва ўсім целе, думкі яе рваліся, нібы новы рой пчол з старога вульля, які шукае сабе новага месца.

Тут Аўгіня прыпомніла тыя незразумелыя словы, якія чула за апошнія гады рэволюцыі.

Гэтыя словы мігнулі ёй цяпер, як раптоўныя праменьні ў вочы. Словы гэтыя, таемныя і вабныя, нібы цапом малацілі па яе сэрцу. Яна аж вочы зажмурыла і давай махінальна шаптаць гэтыя словы і пільна прыслухоўвацца да іх.

Аўгіня пакіравалася раптам у тое страшнае месца, скуль расьсейваліся гэтыя словы, дзе „чорту душу прадаюць", як гаварыў часта поп,—у хату-чытальню...

У гэтай вёсцы хата-чытальня была тым месцам, дзе зьбіраліся людзі на сходы, дзе чыталіся газэты, дзе „валаводзіў" комсамол, куды прыяжджалі „ратары" (оратары) з гораду, якія (як Аўгіне казалі суседкі) гаварылі баечна пекна аб розных простых сялянскіх справах. Словам, хата-чытальня была тым месцам, дзе можна гаварыць аб усім, нават аб сваіх крыўдах...

Крыўд у сэрцы Аўгіні было шмат, перапоўнілі яе грудзі, як той званец, які збожжа глушыць на полі: першым чынам, крыўда на „бога", які даў ёй такі горкі лёс (так тады думала Аўгіня); потым крыўда на мужа, што вечна зьдзекваўся над ёю; пасьля на самаё сябе, што дагэтуль маўчала; у канцы —на „ўвесь сьвет" (вёска і ваколіцы) за тое, што не бараніў яе, што аднасіўся да яе нібыта няўважліва.

Вострым крэменем гэта крыўда драпала ёй горла, гарачай жыжай па жылах расьцякалася, замыкала вусны жалезным замком, выціскала мутную расу з вачэй...

Вочы Аўгіні нібы дымам закурыліся. Яна была ў нейкім сьне на яву. Кожнае сваё пачуцьцё, думку Аўгіня павінна была бачыць, ашчупваць — іначай гэта ёй было няясна. Такім чынам бачыла яна гэту крыўду...

Аб крыўдзе Аўгіня шмат цікавых старасьвецкіх песень ведала, у якіх крыўда адмалёвана, як жывая, з галавы да ног...

Во' цяпер яна, крыўда, скаліць зубы вострыя з-пад гнілога, абросшага сьлізкімі губкамі, плоту. Во, сіняй, кагцістай рукою кліча Аўгіню. Во, урэпілася за яе лапці і не дае ісьці. Во, хрыпам гавора да Аўгіні:

— А чаму-ж ты да гэтага часу са мною не ваявала? Я-ж заўсёды была з табою—пры блінох у хаце, пры жніве на полі. Чаму не ваявала?

— Бо была сьляпая і дурная!—адказвае Аўгіня на свае ўласныя думкі.

Аўгіня пры гэтым першы раз у жыцьці сьцісквае рукі ў кулакі і з пагрозай махае імі перад сабою.

— А цяпер чуеш мяне?

— Чую, чую ў болю сваім,—адказвае Аўгіня зноў на свае думкі. Чую, што тут (яна ўжо падышла да хаты-чытальні) зьнімуць луску цемнаты з маіх вачэй.

Аўгіня адчыніла дзьверы і бокам усунулася ў хату-чытальню.

— Людцы добрыя, ратуйце!—крыкнула Аўгіня.

Шмат моладзі было ў пакоі. Перад Аўгіняй замітусіліся маладыя твары, гарачыя вочы.

Усе з задзіўленьнем кінуліся да яе.

— Якое няшчасьце? Што здарылася?..

Розныя думкі, якія нядаўна жывымі ластаўкамі кружыліся ў галаве няшчаснай кабеты, цяпер заблуталіся, і яна не магла зьвязна апавядаць пра сваё гора.

Але людзі добра зразумелі, уцямілі ў чым рэч.

Галоўным чынам супакоілі цётку Аўгіню комсамолкі. Так лагодна з ёй гаварылі, так шчыра-ласкава на яе глядзелі, пранікаліся яе горам, ажно яе абдало нейкім надзвычайна-прыемным цяплом, і ўвесь боль яе сьціх, прытаіўся...

* * *

Нібы ў казцы цудоўнай, перад Аўгіняй разгарнулася новае, цікавае жыцьцё.

Папершае, яе муж Яўхім кінуў піць і перастаў біць яе, узяўся за наладжаньне сваёй гаспадаркі. Падругое, Аўгіня, як ні дзіўна, пачала вучыцца пісаць і чытаць.

Пальцы яе былі пакрыўлены, як сукі, у мазалёх, пасмаленыя ў печы, патрэсканыя ад працы. Аўгінінае жыцьцё можна было чытаць па яе руках—найлепшы жыцьцёпіс працоўных людзей. У руках відаць была ўся душа вясковай гаротнай кабеціны.

Гэтыя рукі болей усяго вызначаліся, калі ў школе граматы для дарослых яны месца сабе не знаходзілі на белай, як сьнег, паперы. Дрыжэлі рукі ад шастаньня паперы маленькімі дрыгаткамі і як-бы сароміліся, лезьлі часта пад стол, каб іх папера ня бачыла.

Гэтыя рукі, якія там спрытна ўвіваліся пры самай цяжкай сялянскай працы, тут страцілі сваю пэўнасьць і сілу. Пальцы ня складваліся добра, каб ручку трымаць; ручка здавалася Аўгініным пальцам стопудовай булавою.

Здавалася Аўгіні, што нічога на сьвеце няма мудрэйшага, як выводзіць атрамэнтам просьценькія палачкі на паперы—вось такія рысачкі, як на ўсяным коласе... Гэта здавалася тэй кабеціне, якая, апрача майстраваньня бліноў, яшчэ ўмела ткаць найпякнейшыя паяскі, з самымі хітра мудрымі ўзорамі: з грабелькамі, падкоўкамі, васількамі. Яна славілася гэтым на ўсю ваколіцу. Ёй здавалася, што малюнкі вывадзіць куды лягчэй і жывей, чым простыя палачкі ставіць. Вось яна малюнкамі цэлую кнігу напісала-б...

Аўгіня пацела над літарамі. Аркуш паперы здаваўся ёй вялізным жытнім полем, якога яна ня здолее зжаць. Але гэта было толькі першымі днямі. Пасьля яна звыклася і навучылася так-сяк пісаць і чытаць.

У хату-чытальню Аўгіня прыходзіла штодня. Наслухалася шмат цікавых рэчаў. Выступала на сходах з гутаркамі-прамовамі, і зусім іншым чалавекам зрабілася.

Думкі яе выходзілі наўзьверх яскравымі ядранымі словамі, як тая рунь, што відавочна ў цяплыні вылазіць наверх з чорных грудзей тлустай глебы. Ранейшая маўкліваць павялічвала запас яе думак і слоў. Яе талент да бліноў і паяскоў і наогул да сялянскай працы пераліўся цяпер у яе новую грамадзянскую працу. А разам з гэтым яна ня менш, чым раней, працавала і ў хаце.

Аўгіня набыла да сябе павагі ня толькі ў роднай вёсцы, але ва ўсім сельсавеце. Калі хто з бяднячак была чым пакрыўджана—ішла за парадай да Аўгіні. Дзе ладзяцца чырвоныя хрэсьбіны ці вясельле—там Аўгіня рэй вядзе. Трэба сказаць, што набожнай яна ніколі ня была. Ніводнай папоўскай малітвы ня ведала. Аўгіня выкрывала самагоншчыкаў—іх лічыла сваімі заядлымі ворагамі, знахароў лаяла і будзіла цёмных, як яна раней, сялянак да лепшага жыцьця.

Аўгіня як-бы нанова на сьвет нарадзілася, яе заўсёды выбіралі дэлегаткай на зьезды кабет-працаўніц. На зьездах яна вельмі трапка ўмела гаварыць аб гаротным жыцьці сялянак на вёсцы.

Соткі вясковых хустак мітусіліся перад яе вачыма, лавілі кожнае яе слова, і сэрцы ўсіх дэлегатак біліся ў такт з яе сэрцам.

Паводлуг яе прамоў, заўсёды вынасіліся практычныя рэзолюцыі аб організацыі і працы кабет на вёсцы.

Шмат такіх Аўгінь бывала на зьездах, і Аўгіня там бачыла сваю праўдзівую сям'ю.

У ваколіцы ўсе звалі Аўгіню „дэлегаткай" і шмат аб ёй гаварылі, калі ў часопісі пабачылі яе портрэт.

Яе новае жыцьцё, цікавая праца зьнялі з яе твару вечны выраз плачу: вочы былі спакойныя, задумёныя і сьмелыя, зморшчаны згладзіліся. Відаць было, што Аўгіня добра разумее, што яна адна з тых тысяч і мільёнаў, якія будуюць новае сьветлае жыцьцё для ўсіх працоўных.

З. Бядуля.

* * *

Дзед! Ямчэй нам грай на дудцы!
Сабірайцеся сябры,
Засьпявайце песьню дружна,
Бо ўвесь край наш у агні!

Нашы нівы чырванеюць,
Вёскі полымем гараць,
Іх агнём рэволюцыйным
Агарнула наша раць.

Сонца чырвані нам сьвеціць,
Кветкі волі шлюць прывет.
Брацьця! песьню засьпявайце!
Грай ямчэй на дудцы дзед!

Г. Брэская.

Жыццё рабочыцы і сялянкі

НОВЫ БЫТ.

Барацьба сялянкі за новы быт.

Дзе сялянка прачынаецца ад векавой цемры, там мы бачым яе актыўны удзел у грамадзянскім жыцьці і барацьбу за новы быт. Вось характэрны малюнак выступленьня на сходзе сялянак в. *Старыны, Ленінскай сельрады, Горацкага раёну, Аршанскай вакругі.*

Сялянка Дарэўская, якая прыехала з Усебеларускага зьезду сялянак-грамадзяньніц, мелася зрабіць даклад аб працы зьезду.

Кулакі, напіўшыся самагонкі, сарвалі даклад, абзываючы Дарэўскую самымі апошнімі словамі, кажучы: езьдзіла ты ў Менск толькі па свайму капрызу.

Дарэўская не зьбянтэжваецца і ня прымае ў крыўду нанесеных кулакамі зьняваг, а даказвае правасьць Савецкае ўлады.

Яе сястра Тацяна, якая таксама прымала удзел у жаночай конфэрэнцыі, памагае ёй у спрэчцы з кулакамі.

Па іх адрасу сыплецца рад пагроз і ўрэшце кулакі з страечным братам Дарэўскіх, якога яны натруцілі да дзейства сілай, Тацяна была пабіта і прымушана была за дапамогай зьвярнуцца ў сельсавет.

Ня гледзячы на рад пагроз, якія сыпаліся з боку кулакоў, Дарэўскія з'арганізавалі 17 дзяцей, вядуць з імі гутарку, навучаюць рэволюцыйным сьпевам і жадаюць з іх складьці атрад піонэраў.

Кулакі ругаюць за гэта дзяцей і нагаварваюць ім усякіх недарэчнасьцяй.

Але ня гледзячы на ўсё гэта, дзеці кахаюць Дарэўскіх і даведваюцца да апошніх часта.

Жаль толькі, што Дарэўскія—адна малапісьменная, а другая—зусім няпісьменная. Але гэта не перашкаджае ім працаваць.

Есьць яшчэ сябра сельсавету ў той-жа вёсцы, Карнавухава А., але кулакі не падлягаюць ім і кпяць часам, кажучы „Бабскі савет".

Кулакі ня любяць абуджаную жанчыну. Нічога ўтайкай нельга зрабіць, усё жанчыны выводзяць на чыстую вадзіцу. Зямлі і скаціны ні захаваеш ад падаткаў, лішніх асоб у сям'ю ня прыпішаш, самагонкі ў вёсцы ня выганеш.

З гэтае прычыны і злуюць на іх кулакі, мсьцяць і прасьледваюць сялянку-грамадзяньніцу.

Заданьне сельрад і ячэек КП(б)Б ісьці ў гэтых адносінах на дапамогу жанчыне, не дапушчаючы, каб кулак помставаў і прасьледваў сялянку.

Сысоеў Зьмітро.

Сёмага акцябрыла.

(Стрэшынскі раён, в. Мармоль Бабруйскае акругі).

Вышла я замуж за батрака, аднаго з маёнткаў князя Друцкага-Сакалінскага.

Выходзіць замуж за яго пан мне не дазваляў, ажно цяжка ўспамінаць пра мінулае.

Цяпер я маю сем дзяцей, і сёмага акцябрыла.

Жыхарства па сваёй цемнаце кажа: чорту дзіця аддала.

Сьмяюся я з гэтага дый толькі!

Пры Савецкай уладзе я зразумела, стаўшы свабоднай, што акцябрыць дзяцей гэта значыць уводзіць у сям'ю новы быт, пры якім ня прыходзіцца гнуць шыю перад панамі.

Сялянка **Карабанава.**

Трое чырвоных Акцябрын.

(Мяст. Хацімск, Хацімскага раёну, Калінінскай вакругі).

І ў нашым Хацімскім раёне было 5 акцябрын. Новы быт, ня ў хаце культурніка, а ў хаце самага цёмнага селяніна—камандыра кароў і авечак—у пастуха. І вынікі ёсьць.

У адзін дзень было ў нас аж 3 акцябрыны. Вялікая заля народнага дому была перапоўнена людзьмі.

Тут былі сялянкі і сяляне, і працоўныя і школьныя працоўныя і нават мяшчане. Калі стала ціха ў залі, падымаецца заслона і за сталом, пакрытым простай сурвэтай, сядзяць тры пары бацькоў з новароджанымі.

Пад громкія аплодысмэнты сакратар Райкому вітае новароджаных, іх бацькоў, чытае даклад аб новым быце.

Сыплецца цэлы рад прывітаньняў ад усіх організацый.

Прадстаўніца ад жаночага аддзелу вітае матак новарадзіўшыхся, кажучы: „Няхай будзе завісна нашым местачковым жанком, нашым культурнікам, што прачынаюцца ні яны, а прачынаюцца цёмныя забітыя сялянкі—жонкі пастухоў, бяднячкі-сялянкі.

Першым з бацькоў выступае пастух і голасна заяўляе, што жадае даць імя свайму сыну імя той асобы, якая вывела на свабодны шлях працоўных людзей і дала добрае жыцьцё мне і ўсяму народу. Бурныя воплескі.

Хлопчка назвалі Ўладзімірам.

Другім выступае бацька другога хлапца—сябра арцелі і заяўляе, што жадае назваць сына Міхасём у чэсьць нашага сялянскага старасты Міхайла Іванава Калініна.

Трэцім выступае бацька дачкі і просіць назваць яе імем правадыра і вучыцеля, вучэньне якога жыве і сярод нашых дзяцей—просіць назваць яе імем Леніны.

Расьце новы быт у вёсцы, а з ім і сьвядомасьць нашых жанчын.

Людміла Гразнова.

Частушки.

Наша баба Акулина в городе жила,
Все советские порядки скоро поняла,
Возвратилася в деревню стала говорить,
Как крестьянским бабам нужно на деревне жить.

Перво на перво ученье—грамота для всех
И леченье завести, это ведь не грех,
И работал, чтоб толково кооператив,
Да от вшей не расползался по деревне тиф.

Чтобы матери с отцами берегли ребят
Не бросали без надзору, как яких щенят.
Сбережешь дитя—жить будет,—это знает всяк
Аль-не нужен для деревни крепкий молодняк?

Власть Советов молодая—что и говорить
Вот пройдут годов десятки, то то будет жить.
Расцветет деревня наша, перестанет пить
Школы, клубы, мастерские всюду свяжут нить.

Кулакам дадут по шее, церкви и попы
За ненадобностью сгинут, вымрут, как клопы.
Крепко верит Акулина в то: что говорит
Будит словом на деревне тех, кто крепко спит.

М. Яншина

З ЖЫЦЬЦЯ СЯЛЯНКІ.

За 7 гадоў—першая конфэрэнцыя.

(*Аршанская вакруга*).

З раніцы ўжо пачалі зьбірацца дэлегаткі работніцы і сялянкі ўсяго раёну. Сабралася іх больш за 100 асоб. Невялічкае памяшканьне Талачынскага клюбу перапоўнена дэлегаткамі.

А другой гадзіне дня конфэрэнцыя адчыняецца, і з вялікай увагай заслухоўваюцца прывітаньні. Пасьля прывітаньняў слова даецца райорганізатару жанчын для дакладу аб значнасьці шостай гадавіны Жанадцзелу. Раптам у залі пад зыкі бубнаў паяўляецца атрад піонэраў. Гэта яны прышлі вітаць жаночную конфэрэнцыю. Пад гром воплескаў слова прадстаўляецца піонэру. Маленькі, але жывы піонэр бойка вітае конфэрэнцыю, заканчываючы прызывае пасылаць сваіх дзяцей у піонэры і падтрымліваць піонэрскія арганізацыі цёплымі матчыным, адносінамі.

Пад гром воплескаў піонэра падхопліваюць на рукі і адрад выходзіць.

Канфэрэнцыя з увагай заслухвае даклад райорганізатара.

Па дакладу выступілі дзьве дэлегаткі, якія скардзіліся на цяжкае матар'яльнае становішча, што зьяўляецца перашкодай у грамадзянскай працы дэлегатак.

Гэта канфэрэнцыя зьяўляецца ў Талачынскім раёне за 7 гадоў Савецкае ўлады—першай. Пачатак закладзен.

Андросік.

Перавыбары дэлегатак.

(*Равяцічы, Талочынскага раёну.*).

У сялянскую хату, дзе поўна духаты, пры сьвеце газавай лямпы зьбіраюцца сялянкі на сход.

Гоман і гутаркі з усіх куткоў.

Некаторыя з прышоўшых баяцца рэгістравацца.

Былыя дэлегаткі, больш сьмелыя, цягнуць за сабою менш разьвітых сялянак.

Сход адчынены.

Павестка дня: праца Жаночага Аддзелу і перавыбары дэлегатак.

Слухаюць уважліва.

Па дакладу задаюцца пытаньні, падымаюцца спрэчкі, сялянкі выяўляюць свае патрэбы, паняцьці, імкненьні.

Сходам пастаноўлена: прымаць актыўны удзел у грамадзянскай працы і дзеля найбольшай сувязі—выпісаць нікалькі нумароў часопісі „Беларуская работніца і сялянка".

Пасьля сходу сялянкі зьвярталіся да дакладчыка з просьбай перапісаць ім беларускую марсэльезу.

Я. В.

Імкненьне сялянак да асьветы.

У Журавіцкім раёне ў вёсках Хатоўне, Балотне і Іскаве адбыліся агульныя сходы сялянак, на якіх разьбіраліся пытаньні аб зьнішчэньні няпісьменнасьці сярод сялянак.

Пасьля запытаньняў па дакладу ў гэтых трох вёсках запісаліся 42 сялянкі ў гурткі па зьнішчэньню няпісьменнасьці, у якіх ужо адбываюцца заняткі. Кіруюць гуркамі настаўнікі. Заняткі праходзяць па нядзелях з тае прычыны, што ўсе іншыя дні тыдню сялянкі заняты сваёй хатняй працай.

Сялянкі! Бярэце прыклад з сялянак Журавіцкага раёну. Будучы пісьменнымі. Вы зможаце разьбірацца ў працы сельсавету, комітэту ўзаемадапамогі, школы, а праз гэта дапамагаць Савецкай уладзе будаваць нашу маладую Рэспубліку—Савецкую Беларусь.

Ф. Стрыжэвіч.

Зьнішчайце цемру.

(*Вёска Венразі Калчаўскага сельсавету).*

У нашай вёсцы сходам была абрана ў засядацелі на суд сялянка Зося Ліцьвіновіч. На гэтым сходзе матка яе крычала, што гэта зрабілі па злосьці да іхняй сям'і.

Гэты выпадак яскрава паказвае, што цемра яшчэ да гэтых часоў пануе сярод жанчын сялянак.

Вясковыя кабеты, Савецкая ўлада ўсімі мерамі імкнецца да таго, каб ліквідаваць няпісьменнасьць, зьнішчыць пагалоўную цемру сярод нас і мы павінны дапамагаць ёй, ідучы ў школы граматы, вучачыся дзеля сваёй карысьці і паляпшэньня дабрабыту.

О. С.

Старыя ідуць побач з маладымі.

(2-я конфэрэнцыя жанчын-дэлегатак, Чарэйскага раёну, Барысаўскай вакр.)

Нядаўна ў м. Чарэі Барысаўскае вакругі адбылася 2-я раённая конфэрэнцыя жанчын-дэлегатак. Сабраліся 52 сялянкі.

Гэта конфэрэнцыя шмат чаго дала жанчыне-сялянцы: на гэты дзень быў назначаны суд над селянінам, які пабіў сваю жонку. Суд адбыўся да адчыненьня конфэрэнцыі пры прысутнічаньні ўсіх дэлегатак. Народнымі засядацелямі былі дзьве дэлегаткі. Вінавайца быў прысуджаны на 3 месяцы страты свабоды з суровай ізоляцыяй.

Гэты суд паказаў нам, жанчынам-сялянкам, што і ў нас ёсьць абарона.

Выслухаўшы падрабязкова даклад аб значнасьці комітэтаў узаемадапамогі і коопэрацыі, —парашылі і абяцалі ўступіць у сябры коопэратыву і ўцягнуць у гэта і іншых сялянак, і сачыць за працай коопэрацыі, падняць на адпаведную вышыню комітэты ўзаемадапамогі.

Жанчыны-сялянкі зразумелі, да чаго вядзе Компартыя, і шчыра віталі кіраўнікоў па працы сярод жанчын.

Асабліва трэба адмеціць тое зьявішча, што жанчын няпісьменных па гадоў 30-40 было больш на конфэрэнцыі, чымсь дзяўчат.

Год таму назад у нашым раёне такую жанчыну на сход за 20 вёрст не прыцягнуўбы. А цяпер?

Цяпер яны разьбіраюць справы дзяржаўнай значнасьці і патрэбы вёскі.

Сялянка **А. Аляксеева.**

Голас сялянкі-дэлегаткі.

Калі я была выбрана дэлегаткай у 1923 г., я ў той час нічога ня знала аб задачах жанчыны.

У сучасны момант для мяне зразумела і стала больш панятна значнасьць дэлегатак і іх агульныя сходы, дзе нашы сялянкі зьбіраюцца і грамадой абгаварваюць свае пытаньні.

Бываюць на нашых сходах і мужчыны. Некаторыя з іх кажуць: „бабам далі роўныя правы з мужчынамі, яны зараз возьмуцца за мужоў і прымусяць іх праз палку скакаць на аднэй назе".

Праўда, гэта кажуць тыя, якія лічаць лепш на печцы пагрэць свае бакі, а ў сьвята пайсьці ў царкву і паслухаць тоўстапузага папа.

Не, не на печцы нам бакі грэць і ня ў цэркаў хадзіць, а трэба зьбірацца ў свае сялянскія гурткі, на якіх абгаварваць жыцьцёвыя пытаньні і вучыцца.

Досыць быць паднявольнай у сваёй сям'і і гаспадарцы, прэч тыя умовы жыцьця, у якіх жыла наша бедная гаспадыня-сялянка пры царскай уладзе.

Усе за новы быт! Няхай жыве Савецкая ўлада, якая будуе дзяржаву Вольнае Працы!

Сялянка Бароўскае сельрады, Заслаўскага раёну, вёскі Іржавец.

Надзея Ушкевіч.

„Дзіцячая зорка".

(Конзавод Велень).

У нас адбыўся вечар самадзейнасьці, на якім былі зроблены даклады, выпушчаны першы нумар нашай вуснай газэты.

Вусную газэту выпусьцілі нашыя дзеці, таму й назвалі яе „Дзіцячай зоркай".

Нам, бацьком, было проста прыемна глядзець на гэты першы культурны пачатак нашых дзяцей.

Людзей было вельмі многа, і калі разыходзіліся, дык усе казалі адно—„Часьцей-бы".

Мар'я Капціловіч.

Жаночы сход у вёсцы Сярэдзіна.

(Шацкі раён, Менскай вакругі).

У вёсцы Сярэдзіна жаночы сход адбываецца ўпяршыню. Спачатку сялянкі зьбіраліся вельмі памалу, не разумеючы, пашто іх склікаюць. Цяжка нават было зарэгістраваць. Уваходзяць у хату дзяўчаты, рэгіструюцца, а некаторыя бабы, якія ўжо ў хаце, сьмяючыся гавораць ім: „Пішыцеся, пішыцеся, хутка пашлюць вас падлогу мыць у сельсавеце". Рэгістрацыя закончана. Сабралася да 45 сялянак. Сход адчыняецца.

Робяцца даклады аб становішчы жанчыны раней і цяпер і аб значнасьці удзелу жанчыны ў савецкім будаўніцтве. Жанчыны-сялянкі зацікавіліся дакладамі, перасталі сумлявацца, пачаўся абмен думкамі.

У сялянак былі розныя погляды па некаторых пытаньнях. Так, на пытаньне аднае бабы:—ці можна скардзіцца ў Жанадцзеле на тое, што муж пабіў яе, дакладчык растлумачыў, што трэба скардзіцца па такіх пытаньнях у Нарсуд ці ў Сельсавет. У канцы сходу сялянкі абралі 17 дэлегатак.

В. Гурыновіч.

ИЗ ЖИЗНИ РАБОТНИЦ.

Как работницы типографии книги и газеты печатают.

Нам работницам 1-ой типографии хочется рассказать, как мы, ежедневно трудясь, выпускаем в свет книги и газеты, которые читают тысячи человек.

Возьмем на сей раз издание книжки. Автор приносить в типографию рукопись, рукопись эта вначале попадает в наборное отделение, где ручным способом рабочие из особо устроенных ящичков (называются они „кассами“) набирают все то, что написано в рукописи. На этой работе до последняго времени были, главным образом, мужчины. В настоящее-же время на этой работе заняты уже и женщины.



В наборном отделении.

Из наборного отделения набранные и сверстанные, т. е. составленные из шрифта страницы переходят в машинное отделение. Машина пускается в ход электричеством. Машина может пропустить до 1500 экземпляров в час. В машинном отделении, наряду с рабочими работают и работницы.

Но вот страницы отпечатаны, тогда их берут в переплетное отделение. Здесь они фальцуются, т. е. складываются, приводятся в порядок, а затем направляются в склад.

В книгах вы часто видите рисунки. Эти рисунки изготовляются в специальных мастерских, которые называются цинкографиями.

За последние десятилетия типографское дело далеко шагнуло вперед. Изобретены такие машины, которые печатают не 1500 экземпляров, а 25.000 экземпляров в час. Эти машины называются ротационными.

Такие машины имеются и в нашей типографии.

Мы, работницы ведем сейчас кампанию за то, чтобы женщины специализировались-бы во всех типографских работах. Многое нами в этой области уже достигнуто.

Мы участвуем и в общественной жизни нашего предприятия и выполняем наши общественные обязанности не хуже рабочих -мужчин.

Группа накладчиц 1-ой типографии.

В машинном отделении типографии.

Пусть живет Советская власть и Компартия, раскрепостившая домашнюю работницу.

Помню я себя, когда мне исполнилось 10 лет. В виду моего плохого материального положения, я была брошена в руки варваров-эксплоататоров и с того времени до 17 года я переходила от одного хозяина до другого и не видела я ни одного светлого дня. Помнится то время, когда я работала у хозяина гостинницы. У меня было желание исполнить возложенную на меня работу, но как говорится, сколько ни делай, все больше требуют и, таким образом, требования хозяина не были удовлетворены. Раз меня хозяйка стала будить в 2 часа ночи, чтобы я встала работать, но т. к. я была переутомлена, я не могла встать, тогда хозяйка стащила с меня одеяло и стала меня щекотать за ноги, я стала плакать горькими слезами, стараясь, чтобы хозяйка не видела, ибо она угрожала мне за это побоями. У меня уже тогда было стремление к свету и знанию, особенно, когда дети хозяев приходили из школы с книгами и тетрадями, я стала просить их научить меня хотя бы расписываться, но хозяйка ответила, что взяла меня не для того, чтобы учить, а для работы. Я часто приходила домой со слезами к матери и говорила, что я пойду собирать кости, за которые тогда давали по 2 коп. за пуд, но чтобы мне остаться дома хоть одну зиму, чтобы научиться азбуке хотя бы, но мать мне ответила, что я не вхожу в положение родителей (у нас было 8 душ семьи, а отец все время болел и некому было работать).

